

Таццяна МІРОНЬ,
*кіраўнік фізічнага выхавання*
*высшэйшай категорыі,*
*дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці №7*
*г. Ваўковыска Гродзненскай вобласці*

## ГАСЦЁЎНЯ “ЗДАРОВАЯ СЯМ’Я”

# У НАРОДНЫЯ ГУЛЬНІ ГУЛЯЕМ
# ДА ЗДАРОВАГА ЛАДУ ЖЫЦЦЯ ДАЛУЧАЕМ

**Задачы:** арганізаваць абмен інфармацыі паміж бацькамі аб беларускіх рухомых гульнях для павышэння іх ведаў і ўцягнення ў культурную спадчыну; абагачаць вопыт бацькоў па разнастайнасці рухомых і маларухомых народных беларускіх гульнях; далучаць здаровы лад жыцця дзяцей сродкамі разнастайных беларускіх народных гульнях; развіваць уменне ў выхаванцаў выконваць асноўныя віды рухаў па ходзе правядзення рухомых і маларухомых народных берарускіх гульнях; выхоўваць патрыятычныя пачуцці ў дзяцей і дарослых праз беларускія народныя гульні, весялосць і радосць ад сумеснага правядзення.

**Матэрыялы і абсталяванне:** лапці, гарлачык, цацка-мыш, маска ката, муляж каравая,медальёны, ленты-“хвосцікі”, аўдыёзапіс мінусоўка песні “Сёння ў нашай хаце свята”, песня ” Бывайце здаровы” ансамбля “Сябры”.

**Ролі:** вядучы (выхавальнік), Іван Міласцевы (кіраўнік фізічнага выхавання).

**Ход мерапрыемства**

*У зале сядзяць бацькі выхаванцаў, якіх запрасілі прыняць удзел у гасцёўне “Здаровая сямья”. Пад гучанне народнай беларускай музыкі ўваходяць вядучы і Іван Міласцевы, якія вядуць за сабою дзяцей на падрыхтаваныя месцы, а затым становяцца ў центры залы.*

**Вядучы (В.).** Добры вечар, паважаныя дарослыя, дарагія хлопчыкі і дзяўчынкі.

**Іван Міласцевы (І.М.).**

Добры день мае даражэнькія! *(аказваеца да дзяцей)*
Добры дзень мае прыгажэнькія!
Дарослых і дзяцей шчыра я вітаю,
У гасцёўню запрашаю!
Бачу ўсе гатовы,
Значыць трэба пачынаць.

- А ці вы, мае любыя, здагадаліся хто я такі? І чаму я вас запрасіў да сябе ў хату? (Адказы дзяцей). Я, Іван Міласціввы. З маім прозвішчам звязаны нацыянальныя рысы беларускага народа: добразычлівасць, гасціннасць, міласэрднасць. А ў народным календары ёсць восеньскі дзень – дзень Івана Міласцівага.

У гэты дзень усе адзін да аднаго асабліва ўважлівыя, добрыя, ветлівыя, сярдэчныя. Нельга ні ў якім разе каго-небудзь крыўдзіць.

Таксама ў гэты дзень дарослыя з дзецьмі гуляюць у гульні, якія няцуць звычкі і быт беларускага народа, якія дышлі да нас сёння. Сёння мы сабраліся, каб абмяняца вопытам і ведамі аб беларускіх народных гульнях,

якія дапамогуць нам паняць нашу культурную спадчыну, узрадзіць цікавасць да іх сярод нашых дзяцей і пагуляць у іх.

**(В.).** Беларускія народныя гульні - гэта такая ж частка культурнай спадчыны краіны, як песні, танцы, казкі, легенды, якую пакінулі нашы продкі. Яны складаліся на працягу шматлікіх вякоў і маюць сваю гісторыю, традыцыі, саблівасці, прыкметы, нормы, правілы і ўнікальнасць. Гэта неабходна захаваць, берагчы і данасіць да будучага пакалення, знаёміць дзяцей з беларускай культурай і з багатымі беларускімі звычаямі і традыцыямі.

**І.М.** А ці памятаеце вы, паважаныя госці, як на двары, разам з сябрамі гулялі ў гульні вашага дзяціннста? Якія гэта былі гульні? (Адказы бацькоў: "класікіы", "фарбы", "казакі-разбойнікі", "рэзіначка", "ядомае-неядомае, "рыбакі і рыбкі", і інш.). Вам было цікава? (Адказы бацькоў).

А вось сучасныя дзеці вельмі любяць сядзець у гаджатах у сонечны, прыгожы дзень, не заўважаючы прыгажосці прыроды. Яны мала гуляюць у гульні з сябрамі. Але я ведаю, што сярод прысутнічаючых сёння ў зале, ёсць сем'і, якія подтрымліваюць традыціі і культурную спадчыну свайго народа, захоўваючы і перадаючы беларускія гульні з пакалення у пакаленне.

**В.** Сустракайце апладысментамі маці (… Алесі), якая раскажа нам пра беларускую гульню "Лапці", у якую гуляла яна со сваёй матуляй, а сення гуляе са сваей дачкой

*(выдзіць да мальберту маці Алесі і расказывае па малюнках для бацькоў пра гульню "Лапці").*

**І.М.** А вось у сямўі (…Паліны) бацькі любяць гуляць у гульню "Каласкі". *(выходьзіць адзін із бацькоў да мальберту і расказвае па малюнках пра гульню "Каласкі" і прапануе дарослым пагуляць у яе).*

**Беларуская народная гульня**
**"Каласкі"**

**Задачы:** развіваць уменні хутка арыентавацца ў пэуных абставінах; удасканальваць навыкі лёгкага бегу; выховываць вытрымку.

**Абсталяванне:** бутафорскія каласкі.

**Апісанне гульні:** вядучы звяртаецца да дзяцей са словамі: "Яшчэ ў полі за хатай засталіся каласкі. Калі ласка, дарослыя, дапамажыце іх сабраць".

По зале раскладваюцца каласкі. Вядучы выклікае некалькі дарослых. Пад беларускую народную музыку яны рухаюцца па "полі". Калі знікае музыка, кожны стараецца сабраць як мага больш каласкоў. Потым усе разам лічаць каласкі**,** вызначаецца пераможца.

**І.М.** Малайцы! Сапраўдныя гульцы, добра гуляеце, па гэтаму зараз адтрыліваеце падарунак ад дзяцей, песню "Мы жывем у Беларусі"

*(усе выхаванцы становяцца ўрасыпную па зале і спяваюўь песню)*

**Песня "Мы жывем ў Беларусі"** (музыка і словы Л.Смык)

**І.М.** Малайцы, добра пелі. Зараз можно навучыць дарослых гуляць у маю любімую гульню "Адгадай чый галасок". Дзеці гатовы? (Адказы: да). Тады станавіцеся ў круг.

*(усе выхаванцы становяцц ўрасыпную па зале)*

**Беларуская народная гульня**
**"Адгадай, чый галасок"**

**Задачы:** развіваць слыхавую ўвагу, памяць, засяроджаннасць на выкананні задання; выхоўваць арганізаванасць, стрыманасць.

**Абсталяванне:** не патрабуецца.

**Апісанне гульні:** Прапаную вам, дзеці, утварыць круг. Дзяўчынка (імя: Алеся) будзе стаяць по сярэдзіне з заплюшчанымі вачамі. Мы з вамі будзем гаварыць (спяваць) словы:

*Сталі ў куруг, і – раз! Два! Тры!*
*Павярнуліся, сыбры!*

На апошня словы усе паварочваемся пол абарота вакол сябе і спяваем:

*А як скажам – скок, скок, скок…*

Словы "скок, скок, скок" гаворыць той ігрок, на якога пакажу я, Іван Міласцівы.

*Адгадай, чый галасок?*

Гэтыя словы спяваем ўсе разам.

Дзіця, што стаіўь у цэнты з заплюшчанымі вачыма, павінна адгадаць, хто прагаварыў словы "скок, скок, скок". Той, каго пазналі, ідзе на сярэдзіну круга.

**Правілы гульні:** дзіця не можа расплюшчваць вочы да таго часу, пакуль не скончацца словы гульні.

**І.М.** Праходзьце, калі ласка, на свае месцы.

**В.** Гэтая гульня развівае не толькі слыхавую ўвагу, памяць, засяроджаннасць на выкананні задання але і выхоўвае арганізаванасць, стрыманасць, вучыць дзяцей сябраваць, называць друг друга па імені, далучае да дзічячага калектыву, дапамагае вывучаць беларускую мову.

**І.М.** Сёння ў мяне з сабою ёсць торба рэчамі, каб гуляць у гульні. Раней у дзяцей цацак было мала і яны гулялі з простымі рэчамі, што былі у хаце. А вы так зможаце? (адказы дзяцей).

І так дзеці, зараз я прапаную дастаць першую рэч з торбы. Як яна называецца? (Адказы дзяцей: напрыклад лапці). Гэта ж любімы абутак майго сябра, Міхася. А вы ведаеце якую небудзь беларускую гульню з гэтым

абуткам? (Адказы дзяцей: “Лапці”, “Міхась”). Прапаную пагуляць у беларускую народную гульню “Міхась”.

*(усе выхаванцы становяцца у круг , каля лапцей, у цэнтры залы)*

**Беларуская народная гульня**

**“Міхасік”**

**Задачы:** практыкаваць ва ўменні ўзадняць рухі з характарам мелодыі; развіваць спрыт, хуткасць, настойлівасць.

**Абсталяванне:** 6-7 пар абутку.

**Апісанне гульні:** по крузе ставяцца 6-7 пар абутку (лапці), 7-8 удзельнікаў становяцца вакол лапцей, у сярэдзіне Міхасік (хлопец). Дзеці ідуць і гавораць (ці спяваюць) словы:

*Ты, Міхасік, не зявай, не зявай, не зявай!*

*Хутка лапці абувай, абувай, абувай!*

Гучыць беларуская народная мелодыя. Дзеці выконваюць танцавальныя рухі, перамяшчаюцца по крузе. Па сігнале змаўкае музыка), кожны стараецца хутка надзець лапці. Дзеці, якія засталіся без абутку, выбываюць з гульні.

**Правілы гульні:** пры кожным паўторыгульні адна пара лапцей прымаецца; гульня працягваецца да таго часу, пакуль не застанецца адзін удзельнік.

**І.М.:** Праходзьце, калі ласка, на свае месцы.

**В.** Гэтая гульня развівае ўў дзяцей спрыт, хуткасць, настойлівасць, а мы ведаем , што беларускі народ валовае ўсімі гэтымі якасцямі, каб старанна працаваць.

**І.М.** Працягваем даставаць рэчы з торбы. Прапаную выцягнуць наступную (імя дзіцяці) рыч (напрыклад: гарлачык). Дзякуй!

Гэта ж гліняны посуд для смачных страў. А як ён называецца? (Адказы дзяцей: гаршочак, гарлачык, збаночак.). А давайце погуляем у беларускую народную гульню гарлачык.

*(усе выхаванцы становяцца у крух у цэнтры залы, а вядучы – за кругам з гарлачыкам у руках)*

**Беларуская народная гульня**

**“Гарлачык”**

**Задачы:** практыкаваць у гуткім бегу, уменні дзейнічаць па сігнале, хутка арыентавацца; развіваць спрыт, увагу.

**Абсталяванне:** гарлачык (з папье-машэ).

**Апісанны гульні:** дзеці стаяць у крузе. Дзіця- гандляр ходзіць за кругам з гарлачыкам. Усе гавораць (ці спяваюць) словы:

*За гарлачык гэты*

*Дай нам зусім крышку*

*Кб ніколі не хварэць –*

*Маннай кашы лыжку.*

Пасля гэтых слоў дзіця-гандляр спыняецца і ставіць гарлачык на зямлю, а дзеці-пакупнікі (два чалавека, каля якіх паставілі гандляр гарлачык) бягуць по крузе ў розных напрамках. Кожны імкнецца ўзяць гарлачык.

**І.М.:** Праходзьце, калі ласка, на свае месцы.

**В.** Гульня “Гарлачык” паказвае адносіны беларусаў да ежы, за свайго здароў’я.

**В.** Ў нашым гарлачыку ёсць пытанні для нашых бацькоў. Адносіны беларусаў да ежы, знайшлі свае адлюстраванне ў беларускіх народных гульнях і прыказках. Зараз мы будзем з гарлачыка прыказкі дасаваць, а затым бацькі будуць закончыць іх спрабаваць *(вядучы дастае з гарлачыка прыказкі, чытае палову, а бацькі спрабуюць яе закончыць)*

**Прыказкі аб ежы з гарлачыка**

1. Дзе каша і аладка, … (там будзе і грамадка).
2. Кашу маслам ... (не сапсуеш).
3. Сыты галоднаму ... (не таварыш).
4. Будзе час - … (будзе квас).
5. Як ем - … (і глух, і нем)
6. Чалавек галодны… (ні на што не годны)
7. Смачна было, … (ды блізка дно).
8. Як зварыш, …(так і з'ясі).
9. На смачны кусочак… (знойдзецца раточак).
10. Хлеб свежы… (смачны для ежы).
11. Калі хлеб у возе , … (то няма бяды ў дарозе).
12. Хто як працуе ... (той так і есць)
13. Госць, не дзьміся,… (еш, што ў місе).
14. Без капусты…. (на стале пуста).

**І.М.:** Бачу прыказкі вы (бацькі) добра ведаеце. А вось у беларускія танцы-гульні гуляць таксама майстры? Зараз дзеці вас навучаць, а мы паглядзім. Усіх запарашаем на танец-гульню “Ты не стой у баку”. Для гэтага папрашу дарослых і дзяцей стаць у круг па парах.

*(Дзеці становяцца ў знешкі круг, дарослыя – унутраны).*

**Гульня – танец “Ты не стой ў баку”**

**Задачы:** развіваць слыхавую ўвагу, памяць, спрытнасць на выкананні задання паводле слоў; выхоўваць арганізаванасць.

**Абсталяванне:** не патрабуецца.

**Апісанне гульні:** дарослыя і дзеці стаяць у парах по крузе. Усе слухаюць словы і выконваюць розныя заданні паводле слоў, уважліва, дакладна, хутка. Дарослыя і дзеці спяваюць словы (кожная страфа 2 разы):

Ты не стой ў баку, пакланіяся сябруку. *(павароты направа, налева, паклон)*

Пакруціліся, пакруціліся, дружна ўсе спыніліся. *(круціцца направа, налева)*

Не шкадуй, не шкадуй, сваех ручак не шкадуй. *(пляскаць у далоні сябру)*
Пакруціліся, пакруціліся, дружна ўсе спыніліся. *(круціцца направа, налева)*
А цяпер паспрабуй дружна тупнуць, паспрабуй. *(тупаюць нагамі)*
Пакруціліся, пакруціліся, дружна ўсе спыніліся. *(круціцца направа, налева)*
Так і скончым стаяць, сабраліся уцякаць. *(аддымаюць сябра)*
Пакруціліся, пакруціліся, дружна ўсе спыніліся. *(круціцца направа, налева)*
Ой, ой, ой, ой. *(жартуюць, як быцам захварэла спіна,трымаюцца за яе)*

**І.М.:** Прахо дзьце, калі ласка, на свае месцы.

**В.** Гульня – танец "Ты не стой у баку" дапамагае развіваць дзецям слыхавую ўвагу, памяць, спрытнасць на выкананні задання паводле слоў, а таксама з'яднойвае дарослых і дзяцей, дастаўляя радасць ад сумесных рухаў.

**І.М.:** Малайцы! Доба ладзяцца ў мяне з вамі сёння гульні.
Настаў час наступную рэч даставаць. Дастае кавалак каравая, які паздяўбалі птушкі.

- Ой, гэта ж кавалак майго каравая, для вераб'ёў. Яны надтаж любяць, калі ім сыплюць зернеткі і крошкі. А вы ведаеце гульню пра вераб'ёў? (Адказы дзяцей: "Вераб'і і кошка"). Давайце погуляем у беларускую народную гульню"Вераб'і і кошка".

*(выхаванцы становяцца ў шарэнгу у ніжняй плошчы залы)*

**Беларуская народная гульня**
**"Вераб'і і кошка"**

**Задачы:** практыкаваць у гуткім бегу, уменні дзейнічаць па сігнале, хутка арыентавацца; развіваць спрыт, увагу.

**Абсталяванне:** маска ката, медалёны "вераб'і".

**Апісанны гульні:** дзеці – "вераб'і" стаяць урассыпную па залу. Дзіця- "кот" спіць у старане. Дарослы (ці вядучае дзіця) і дзеці гавораць (ці спяваюць) словы:

Дарослы: Хто сіддзіць там на трубе, грэе свае ножкі?
Дзеці: Гэта шэвы верабей, ён азябнуў трошкі.
Дарослы: Сыплю я для вераб'я, зернеткі і крошкі.
Дзеці: Прыляцеў бы я да вас, ды баюся кошкі.

**Правіла гульні:** дзеці павінны ісці па крузе да слоў "ды баюся кошкі", пасля слова ката "мяў" - уцякаць; вымаўляць тэкст трэба дакладна, зразумела.
практыкаваць у гуткім бегу, уменні дзейнічаць па сігнале, хутка арыентавацца; развіваць спрыт, увагу.

**В.** Гульня "Верабы і кошка" практыкуе дзяцей ў хуткім бегу, уменні дзейнічаць па сігнале, хутка арыентавацца; развівае спрыт, увагу, а таксама вучыць клапаціцца аб птушках, якія вывуць у Беларусі.

**І.М.:** Малайцы! Вось і засталася ў мяне ў торбе апошняя рэч. Дастану сам.

Ой! Нешта ўгрызла мяне за руку ў торбе. Можа вы жадаеце паглядзець, што там такое ляжыць? Хто смелы дастане? (Іван прапануе дастаць дзіцяці з торбы мыш).

Да гэтаж мыш, якая прагрызла падлогу ў маёй хаце. А можа падскажыце, каго трэба ў хаце завесці, каб збавіцца ад гэтых шкадлівых мышэй. (Адказы дзяцей: ката).

А вы ведаеце якую небудзь берарусскую гульню пра ката і мышэй? Як яна называецца? (Адказы дзяцей: "Кот і мышы" , "Шэры кот").

Давайце пагуляем з вамі ў гульню "Шэры кот". Чапляйце"сабе "хвосцікі" сзаду).

*(выхаванцы становяцца па парах у ніжняй плошчы залы)*

**Беларуская народная гульня**
**"Шэры кот"**

**Задачы:** ўдасканальваць навыкі бегу з лоўляй і адхіленнем; развіваць спрыт, хуткасць рэакцыі; выхоўваць упэўненнасць у сваіх сілах, сяброўскія адносіны.

**Абсталяванне:** ленты-"хвасты", маска ката.

**Апісанне гульні:** Мышы становяцца за катом парамі у калонну. Кот стаіць перад дзецьмі-мышамі. Паміж катом і мышамі ідзе размова:

- *Ёсць у стозе мышы?*
- *Ёсць!*
- *Ката баяцца?*
- *Не!*
- *А я, кот катафей, разганю ўсіх мышэй!*

**Правілы гульні:** дзеці павінны знаходзіцца ў калонне да слоў "разганю ўсіх мышэй", пасля ўцякаць; вымаўляць тэкст трэба дакладна, зразумела.

**І.М.** Малайцы! Праходзьце, калі ласка, на свае месцы.

**В.** Гульня "Кот і мышы" дапамагае дзецям ўдасканальваць навыкі бегу з лоўляй і адхіленнем; развівае спрыт, хуткасць рэакцыі; выхоўвае ўпэўненнасць у сваіх сілах, сяброўскія адносіны.

**В.** Вось і падыйшло к канцу наша мерапрыемства. Калі ласка, дарослыя, пералічце беларускія народныя гульні, якія вы сёння ўбачылі (Адказы бацькоў: "Адгадай, чый галасок", "Міхасік", "Гарлачык", "Ты не стой ў баку", "Вераб'і і кот", "Шэры кот"). Малайцы!

**І.М.** Усе сённяшніе гульні, яшчэ раз паказываюць, што беларусскі народ дружалюбны згуртованы і гасцінны. Гэта яскрава праяўляецца у беларускіх нацыянальных гульнях. Будзем разам вучыць праз гульні малодшае пакаленне падтрымліваць адзін аднаго, быць гатовымі прыйсці на

дапамогу і заховываць сяброўскія сувязі. Усе гэтыя якасці, нараўне з гістарычнай устойлівасю, робяць беларускі народ асаблівым.

Шчыра дзякую ўсім, што былі актыўнымі ўдзельнікамі беларускіх народных гульняў. Спадзяюсь што сустрэча была добрай, светрай і карыснай. Вельмі хочацца, каб вам, паважаныя госці, штосьці запомнілася, каб вы пагулялі ў нашыя гульні з дзецьмі ў свабодны час і на святах. На развітанне пажадаем, каб жыццё ў вашых хатах было багата, а на душы і сэрцы – добра і ветліва, як сёння ў нашай хаце.

**І.М.:** На свеце ўсё канец свой мае,
І ты, мінуціна змяркання,
Спяеш нам песню раставання.

- **Гучыць песня ” Бывайце здаровы”, якая выконваецца ўсімі ўдзельнікамі (дарослымі)**

( Пакуль дарослыя співаюць выхавацель группы раздае памятныя мядалі дзецям аб сустрэчы ў гасцёўне “Здаровая сям’я”)

**І.М. і вядучы:** Да пабачэнны, да новых сустрэч у гасцёўне “Здаровая сям’я”!

Усе развітваюцца і разыходзяцца.

ЛІТАРАТУРА:

1. Учебная программа дошкольного образования. – Минск : Нац. ин-т образования, 2023.
2. Шабека, В. Выкарыстанне беларускіх народных гульняў у фізічным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту / В Шабека // Пралеска. - 2019. №9. – С. 22.
3. Лях, Н.У. Беларускія народныя гульні ў фізічным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту (з вопыту работы) / Н.У. Лях. – 2-выд. – Мінск : Зорны Верасок, 2017. – 231с.
4. Плалыгіна , Н.В. Далучэнне да беларускай нацыянальнай культуры сродкамі народных гульняў : дапаможнік для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашколнай адукацыі / Н.В. Пралыгіна ; пад агульнай рэдакцыяй М.У.Чачэты. – Мазыр : ТАА ВД “Белы Вецер”, 2006. – 73 [3] с. : іл. – (З вопыту работы дашкольных устаноў).